

# Эрнэст Хемінгуэй

(1899 – 1961)

# Дзяцінства

- Эрнэст Хемінгуэй нарадзіўся ў прыгарадзе з прывілеямі каля Чыкага, штат Ілінойс (ЗША).
- Яго бацька – Кларэнс Эдмант Хемінгуэй быў урачом, а маці – Грэйс Хол – прысвяціла жыццё выхаванню дзяцей.



# Дзяцінства



- Бацька з ранняга дзяцінства спрабаваў прывіць дзецям любоў да прыроды, марыў аб тым, каб Эрнэст пайшоў па яго слядах і стаў займацца медыцынай.
- Калі хлопчыку было ўсяго тры гады, бацька падарыў яму першую вудачку і ўзяў з сабой на рыбалку.
- К 8 гадам будучы пісьменнік ужо ведаў на памяць назвы усіх дрэў, кветак, птушак, рыб, звяроў, якія абіталі на тэрыторыі Сярэдняга Захаду.
- Другім любімым заняткам для Эрнэста стала літаратура. Хлопчык гадзінамі сядзеў за кнігамі, якія мог знайсці ў дамашняй бібліятэцы.

# Першая сусветная вайна



- Пасля выпуску са школы ён вырашыў паступаць ва ўніверсітэт, як таго патрабавалі бацькі, але пераехаў у Канзас – Сіці, дзе ўладкаваўся на працу ў мясцовую газету «Star».
- Хемінгуэй хоцеў служыць у арміі. Ён змог трапіць на фронт Першай сусветнай вайны ў Італіі, запісаўшыся шафёрам – дабравольцам Чырвонага Крыжа.
- 8 ліпеня1918 года Хемінгуэй трапіў пад абстрэл аўстрыйскіх мінамётаў, быў цяжка паранены, але застаўся жывы. У шпіталі з яго цела вынялі 26 асколкаў.

# Вяртанне дамоў

- У 1919 годзе Эрнэст вярнуўся ў ЗША героем – аб ім пісалі цэнтральныя газеты як аб першым амерыканцы, параненым на італьянскім фронце.
- Амаль год Хемінгуэй правёў у коле сям'і, залечваючы атрыманыя раны і думаючы аб будучым.
- У 1920 г. ён пераязджае ў Таронта, каб зноў вярнуцца да журналістыкі.



- У 1921 г. Эрнэст жэніцца на маладой піяністцы Хэлі Рычрдсан і разам з ёй накіроўваецца ў Парыж, у горад, у якім даўно марыў пабываць.

# 1920-я гады



- Хемінгуэю неабходна было шмат працаваць, каб мець сродкі да існавання і дазволяць сабе падарожжы па свеце ў летнія месяцы. І ён пачынае штодзённа адпраўляць у «Toronto Star» свае апавяданні.

- Хемінгуэй з сынам Бамбі

# Літаратурнае прызнанне

- Першы сапраўдны пісьменніцкі поспех прыйшоў да Хемінгуэя ў 1926 годзе пасля выхаду ў свет твора «І ўсходзіць сонца».
- І ўсё ж па большасці Хемінгуэя памятаюць па рамане «Бывай, зброя!» (1929)



- Хемінгуэй і Марта Гелхарн.

# Фларыда



- У пачатку 1930 года Хемінгуэй вярнуўся ў ЗША і пасяліўся ў маленькім горадзе Кі-Уэст, штат Фларыда. Тут ён захапляецца рыбалкай, падарожнічае на сваёй яхце да Багамскіх астравоў і да Кубы, і піша новыя аповеды.
- Па меркаваннях біёграфаў, менавіта ў гэты час да яго прыйшла слава вялікага пісьменніка.

# Афрыка

- У 1933 годзе Хемінгуэй узяўся за зборнік апавяданняў «Пераможца нічога не атрымлівае», даходы ад якога ён плануе патраціць на здзяйсненне сваёй даўняй мэты – доўгатэрміновае сафары ў Паўднёвай Афрыцы.
- Хемінгуэй прыязджае ў раён возера Танганьіка, дзе наймае абслугоўваючы персанал і правадыроў з мясцовых жыхароў, разбівае лагер і пачынае выязджаць на паляванне.



# Грамадзянская вайна ў Іспаніі

- У пачатку 1937 года пісьменнік заканчвае сваю чарговую кнігу – «Мець ці не мець».
- Пачаўшаяся ў Іспаніі грамадзянская вайна вельмі ўсхвалявала Хемінгуэя. Ён прыняў бок рэспубліканцаў, якія змагаліся з генералам Франко.
- У самыя цяжкія дні вайны Хемінгуэй знаходзіўся ў Мадрыдзе, які быў у асадзе фашыстаў.
- Пад час бамбёжак і артабстрэлаў ён пісаў рэпартажы.
- Уражанні ад вайны знайшлі адлюстраванне ў адным з самых вядомых раманаў пісьменніка – «Па кім звоніць звон» (1940).

# Другая сусветная вайна

- У 1941 годзе Хемінгуэй адправіўся ў Балцімор, дзе на мясцовай судаверфі купіў вялікі марскі кацер, даўшы яму назву «Пілар». Перагнаў судна на Кубу, дзе займаўся марской рыбалкай.
- Аднак 7 снежня Японія напала на ЗША, атакаваўшы базу Перл-Харбар. У адказ амерыканцы ўступілі ў вайну і Атлантычны акіян ператварыўся ў зону актыўных баявых дзеянняў.
- З пачаткам Другой сусветнай вайны ён узнавіў сваю журналісцкую дзейнасць, пераехаўшы ў Лондан у якасці карэспандэнта.



# Другая сусветная вайна



- У 1944 годзе Хемінгуэй удзельнічае ў баявых палётах бамбардзіроўшчыкаў над Германіяй і акупіраванай Францыяй.
- Пад час высадкі саюзнікаў у Нармандыі дабіваецца дазволу на ўдзел у баявых і разведвацельных дзеяннях.
- Эрнэст удзельнічае ў баях за Парыж. Бельгію, Эльзас, часта аказваецца на перадавой уперадзе асноўных войск.

# Куба

- У 1949 годзе пісьменнік пераязджае на Кубу і ўзнаўляе сваю літаратурную дзейнасць. Тут ён піша сваю знакамітую аповесць «Стары і мора» (1952).
- У 1953 годзе Хемінгуэй атрымаў Пулітцэраўскую прэмію за гэты твор.





# Нобелеўская прэмія

- Гэты твор паўплываў таксама на прысуджэнне аўтару Нобелеўскай прэміі ў 1954 годзе.
- У тым жа годзе Хемінгуэй пачынае працу над аўтабіяграфічнай кнігай аб Парыжы 1920-х гадоў – «Свята, якое заўсёды з табой», чкая выйшла толькі пасля смерці аўтара.



# Апошнія гады жыцця

- Хемінгуэй пакутаваў ад шэрагу фізічных захворванняў, у тым ліку ад гіпертаніі і дыябету. Аднак для «лячэння» быў накіраваны ў псіхіятрычную клініку Майё.
- У якасці лячэння прымянялася электрасутаргавая тэрапія.
- Пасля 20 сеансаў ЭСТ Хемінгуэй страціў памяць і магчымасць фармуляваць думкі пісьмова: калі спатрэбілася, ён нават не змог напісаць некалькіх слоў афіцыйнага прывітання.

# Адыход

- 2 ліпеня 1961года ў сваім доме ў Кетчуме, праз некалькі дзён пасля выпіскі з псіхіятрычнай клінікі Майё, Хемінгуэй пакончыў жыццё самагубствам.
- Ён застрэліўся з любімага ружжа, не пакінуўшы прадсмяротнай запіскі.



# Мемарыял Хемінгуэю на Кубе





ВСЕ ПИСАТЕЛИ ДЕЛЯТСЯ НА ДВА ВИДА
одних читают, других перечитывают